Новак В. С.

ВЕСНАВЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ АКЦЯБРСКАГА РАЁНА

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

(Паступіў у рэдакцыю 16.09.2019)

У працэсе вывучэння лакальных асаблівасцей фальклорна-этнаграфічных з'яў надзвычай каштоўнымі з'яўляюцца непасрэдныя ацэнкі іх з пункту гледжання саміх носьбітаў духоўнай традыцыйнай культуры. У дадзеным артыкуле выкарыстаны апублікаваныя і архіўныя матэрыялы па фальклорна-этнаграфічнай спадчыне Акцябрскага раёна Гомельскай

РИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.

вобласці. У гэтай мясцовасці, у параўнанні з веснавой каляндарна-абрадавай паэзіяй іншых раёнаў рэгіёна, абрады і песні веснавога цыкла земляробчага календара прадстаўлены сціпла. Як вядома, Масленіца адносіцца да абрадаў пераходнага перыяду, аднак у дадзеным выпадку спачатку засяродзім увагу менавіта у межах разгляду веснавой каляндарна-абрадавай паэзіі на звестках пра мясцовую спецыфіку масленічных святкаванняў.

Нешматлікія звесткі па масленічнай абраднасці прыводзіць В. Р. Багдановіч, артыкул якой «З духоўнай спадчыны» апублікаваны ў кнізе «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Акцябрскага раёна»: «Свята гэта (Масленіца) і зараз адзначаецца на Акцябршчыне і з'яўляецца адным з самых масавых і любімых свят» [1, с. 444]. Аўтар звярнула ўвагу на найбольш распаўсюджаныя элементы масленічнага абраду: «Паколькі гэты абрад у глыбокай старажытнасці меў магічнае прызначэнне завяршаць сабой зіму, то асноўным зместам яго было культавае ўшанаванне сонца як сімвала цяпла і блізкай вясны. Адсюль і такія моманты масленічнага абраду, як катанне па крузе на санях і выпечка бліноў (круг сімвалізуе сонца)» [1, с. 445]. Зыходзячы са сведчанняў жыхароў, неад'емнымі элементамі масленічнага абрадавага комплексу былі запальванне кола, спальванне лялькі як сімвала адыходу зімы, ваджэнне карагодаў: *«Яшчэ памятаю, што запальвалі кола, палілі сімвалічную ляльку – зіму. Потым пачыналі вадзіць карагоды»*[1] (зап. ад Ганны Іванаўны Дайнека, 1946 г. н., у в. Пружынішчы).

Абрад пад назвай «Калодка» таксама быў вядомы ў мясцовай традыцыі: *«Ведаю яшчэ такое, што на масленкавым тыдні збіраліся жанчыны, бралі пояс ці папругу і прывязвалі адзін канец да абрубка дрэва, а другі – да нагі халастога хлопца, які ім сустракаўся па дарозе, як бы за тое, што яшчэ хлопец не ажаніўся. Гэты хлопец з абрубкам пад жарты ўсіх ішоў да хаты, дзе ёсць дарослая дзяўчына. А дзяўчына ў сваю чаргу павінна была запрасіць гасцей у хату і пачаставаць рознымі прысмакамі»* (зап. ад Ганны Іванаўны Дайнека, 1946 г. н., у в. Пружынішчы).

Нешматлікія звесткі прадстаўлены пра абрад гукання вясны на тэрыторыі Акцябрскага раёна. Як вынікае з этнаграфічных апісанняў, гукалі вясну на Дабравешчанне («Благавешчанне»). Як паведаміла Кацярына Мікалаеўна Іскрыцкая, 1924 г. н., з вёскі Рассвет, *«да гэтага дня нельзя капаць зямлю, гарадзіць плот, не пачыналі сяўбу, ніколі не выганялі кароў. Не рабілі нічога. Нават гавораць: "На Благавешчанне дзеўка косу не пляце, птушка гняздо не ўе»*. Выхад на высокае месца, выбар дзяўчыны на ролю «Вясны», зварот да бацькоў з просьбай дазволіць гукаць вясну, ваджэнне карагодаў, выкананне песень-вяснянак – асноўныя моманты ў структуры абраду гукання вясны. Яскравай ілюстрацыяй, як адбываўся гэты абрад у вёсцы Курын, з'яўляюцца ўспаміны Ніны Іванаўны Жынко, 1928 г. н., прадстаўленыя ў артыкуле «Традыцыйная мастацкая культура Акцябрскага

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, а таксама фальклорныя крыніцы ўстаноў культуры Акцябрскага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

раёна»: *«На Благавешчанне ў в. Курын збіраліся дзяўчаты гуртам. Выбіралі “Вясну” – самую прыгожую дзяўчыну, якая яшчэ і лепш за ўсіх спявала. Потым ішлі за сяло гукаць вясну, але перад гэтым пыталі дазволу ў бацькоў:*

Мама, тата, благаславіце Маці-Вясну гукаці.
На буйнае жытачка,на ціхае лецечка.

Бацькі адказвалі:
Благаслаўляем вас, дзеці.
Ідзіце вясну гукайце,
Зіму праводзьце» [2, с. 17 – 18].

З асаблівай пашанай жыхары Акцябрскага раёна адносіліся да велікодных святкаванняў. Разам з гэтым інфарманты ўзгадвалі і пра Вербную нядзелю, «нядзелю перад Вялікаднём»: *«У гэты дзень трэба свяціць галінкі вярбы ў царкве. Імі сцябалі і прыгаворвалі:*

Вярба б’е, не я б’ю,
За тыдзень Вялікадзень.
Будзь здаровы, як вада,
Будзь багаты, як зямля!

Галінкі сахранялі. Калі першы раз выганялі кароў, то паганялі імі» (зап. ад Кацярыны Мікалаеўны Іскрыцкай, 1924 г. н., у в. Рассвет). Асвечаныя ў царкве галінкі вярбы захоўвалі і жыхары іншых вёсак, напрыклад, Валосавічы, бо лічылася, што іх магічная сіла забяспечыць здароўе свойскай жывёлы: *«Прынесеныя з царквы галінкі сахранялі, штоб выганяць імі жывёлу на пашу першы раз пасля зімы. Шчыталася, што тады жывёла будзе здароваю»* (зап. ад Ніны Аляксандраўны Агейчык, 1938 г. н.).

Велікодныя абрады і звычаі захоўваюць агульнаэтнічную традыцыйную аснову. Сярод важных абрадавых кампанентаў велікоднай абраднасці вылучаюцца наступныя: падрыхтоўка ў Чысты чацвер хаты да свята (мыццё падлогі, развешванне чыстых ручнікоў і настольнікаў), фарбаванне яек, выпяканне «пірагоў», наведванне царквы, звычай разгаўляцца за святочным сталом (*«Бацька браў адно яйка і дзяліў яго на ўсіх членаў сям’і. Такжа дзялілася і пасхальная булка. Патом ужэ елі ўсё ўволю: мяса, каўбасы, аладдзі, масла, сыр, пірагі»* – зап. ад Ульяны Лявонцьеўны Кандратовіч, 1914 г. н., у в. Гаць), гульня ў біткі з пафарбаванымі яйкамі, распальванне вогнішча (*«У Чырвоную суботу маладзёж паліла агні аж да самага утра. Эта пайшло ад таго, што перад празнікам усе ў хаце прыбіраліся і на дварэ выграбалася смецце, якое зносілася ў кучы і спальвалася»* – зап. ад Ульяны Лявонцьеўны Кандратовіч, 1914 г. н.). Што да рытуалаў, якія праводзіліся ў Чысты чацвер, адзначалася, што *«смецце спальвалі ў печы, прыгаворваючы: “Няхай гарыць благое, а добрае застаецца”»* [2, с. 18].

Надзвычай строга мясцовыя жыхары падыходзілі да абавязковай у велікоднай абраднасці цырымоніі асвячэння страў у храме: *«Усе члены сям’і адзяваліся ў добрую адзежу. У каробку абязацельна клалі тры крашаныя яйкі, пірог, смажанае мяса. Усё гэта везлі ў царкву на асвячэнне. У каго былі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

коні, тыя ехалі на конях, хто іх не імеў, ішлі пяшком. Калі хто па нейкай прычыне не мог пайсці ў царкву, то клаў яйкі наўкула варот, і вот так асвячалі. Шчыталася, што ў ету ноч сіла нябесная і Гасподзь асвячае ўсю зямлю» (зап. ад Ульяны Лявонцьеўны Кандратовіч, 1914 г. н., у в. Гаць).

Пэўных правіл прытрымліваліся і падчас велікоднага застолля. Як правіла, пасля праведзенай у царкве ночы («служба ідзе ўсю ноч») усе імкнуліся трапіць хутчэй дадому, бо, згодна з народнымі вераваннямі, трэба было спачатку абавязкова пакаштаваць асвячоныя пірог і яйка. Адметным быў той момант, што *«першыя тры дні вялікаднай нядзелі на сняданне бацька дзяліў па яйку на ўсю сям'ю і па кавалку свянцонага пірага, а потым елі астатнюю ежу. Пасля снядання ці абеду свянцоную ежу нельга каштаваць – вялікі грэх»* (зап. ад Соф'і Яфрэмаўны Тукач у в. Гарохавішчы).

З пасвячонымі яйкамі на Вялікдзень былі звязаны такія рытуалы гульнёвага характару, як «біццё яйкам аб яйка» і іх «катанне»: *«Пасля, гуляючы, білі яйкам аб яйка. Выграваў той, чыё яйка было самае крэпкае. Такі чалавек выграваў многа яек. Шчэ адна гульня з яйкамі на Вялікдзень – каташы. Рабілі спецыяльныя лубкі для етага. Пабедзіцелем быў той, чыё яйка адкотвалася дальшэ»* (зап. ад Ульяны Лявонцьеўны Кандратовіч, 1914 г. н., у в. Гаць). Каб дзеці не хварэлі на працягу года, а таксама былі прыгожымі, яны, паводле павер'яў, павінны былі памыцца той вадой, у якую папярэдне клаліся асвячоныя яйкі: *«Шчэ перад тым, як сесці за стол, маці клала ў міску яйкі крашаныя і залівала іх вадою. Етаю вадою патом усе ўмываліс, штоб увесь год быць красівымі і здаровымі»* (зап. ад Ульяны Лявонцьеўны Кандратовіч, 1914 г. н., у в. Гаць). «У вёсцы Буда Парэцкага сельскага савета маці свянцоным яйкам усім дзецям качала па твары, прыгаворваючы словы: "Каб было здароўе"» [2, с. 19].

Супярэчлівымі з'яўляюцца звесткі аб тым, што на Вялікдзень у вёсках Акцябрскага раёна хадзілі валачобнікі. В. Р. Багдановіч у згаданым вышэй артыкуле ўпэўнена прыгадвае пра гэты абрад, але не прыводзіць у якасці доказу пэўных звестак. Архіўны фальклорна-этнаграфічны матэрыял, запісаны выкладчыкамі і студэнтамі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны ў розныя гады на тэрыторыі Акцябрскага раёна, не дае падставы сцвярджаць, што менавіта так і было, хоць тэрмін «валачобнае» сустракаецца ў некаторых этнаграфічных апісаннях. Напрыклад, паводле сведчанняў Ульяны Лявонцьеўны Кандратовіч, 1914 г. н., з вёскі Гаць, *«у еты дзень па хатах хадзілі дзеці-валачобнікі»*. У вёсцы Забалацце на Вялікдзень *«хадзілі ўнукі к бабушкам, якія іх купалі. Бабушкі давалі ім красныя яйкі, булкі, всякія гасцінцы»* (зап. ад Раісы Аляксандраўны Луцковіч, 1937 г. н.). Як вынікае з архіўных фальклорных крыніц, што захоўваюцца ва ўстановах культуры Акцябрскага раёна, выконваліся ў мясцовых вёсках і варыянты валачобнай песні, адрасаванай бабцы:

Да прыйшоў баран, баран пад акенца,
Сад зялёны вішнёвы!
Ой, ці прадуць дзеўкі валакенца?
Каторая не прадзе, за барана пойдзе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А ў барана круты рогі, кучарава барада.
Да былі ў бабкі ды тры куркі-рабкі.
Да неслі яец і вечачка, й карабец.
Да прыйшлі да бабцы валачобнікі.
Валачобнікі – усе бабіны ўнучкі.
Падавала бабка да ўсім па яечку.
Ой, адной сіраце да й не выйшлася.
Дае бабка сіраце яечную лусту,
А сірата не бярэ і спасіба не дае.
Пайшла тая сірата за новыя варата,
Да не дзякуючы, не падскакуючы.
Ой, вярніся, сірата, цябе Бог кліча.
Дае бабка сіраце яечка,
А сірата ўзяла да й спасіба дала (зап. ад Аксінні Брокар, 1902 г. н., у в. Слабодка) [3, с. 24].

Зыходзячы з іншых этнаграфічных звестак, напрыклад, запісаных у вёсцы Гарохавішчы, вынікае, што валачобны абрад не меў месца ў структуры велікоднай абраднасці: *«Валачобнікі ў нашым сяле не хадзілі, але песні спявалі:*

Прыйшла сірата,
Атварыла варата.
Была ў бабкі курка-рабушка,
Знесла яец вечка і карабец.
А прыйшла сірата,
Атварыла варата:
“Дай, бабка, валачобнае”.
Бабка не дома.
Заплакала сірата,
Зачыніла варата (запісана ад Тукач Соф’і Яфрэмаўны). Варта адзначыць, што ў в. Новая Дуброва “валачобнікі не хадзілі, але песні спявалі”» [2, с. 19].

Юраўскае свята, якое лічылася «прастольным святам у вёсках Ламавічы і Майсееўка» [3, с. 26], адзначалася 6 мая. Менавіта ў гэты дзень адбываўся абрад першага выгану жывёлы ў поле, падчас якога выкарыстоўвалі пасвечаныя яйкі і галінкі вярбы: *«Да яго гатовяцца, і перад тым як выгнаць, усю жывёлу ўганялі на двор перад хлявом. Хазяін браў свячонае яйцо і абхажваў ім кожную жывёлу. Шчыталася, што ета спрыяе іх здароўю на ўвесь год. Калі праганялі жыўёлу ў поле, то бралі вербавы пруток, які дзяржалі ад Вербнай нядзелі, і білі ім жыўёлу, штоб яна была здаровай»* (зап. ад Евы Яўхімаўны Кандратовіч, 1925 г. н., у в. Гаць).

У вёсцы Пружынішчы на Юр’е, зыходзячы са сведчанняў жыхароў, вадзілі карагоды вакол дзяўчыны, якую называлі Лёляй і якая сімвалізавала багіню вясны: *«А дзяўчына, якую выбралі, была ўвасабленнем багіні вясны – Лёлі. Дзяўчына таксама потым пляла для іншых вянкі, якіх дзяўчаты бераглі да канца вясны»* (зап. ад Ганны Іванаўны Дайнека, 1946 г. н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адным з найбольш любімых свят, як адзначаюць жыхары, было апошняе веснавое свята – Тройца, або Сёмуха: *«Ета адзін з такіх больш распаўсюджаных празнікаў Рудабельскага краю»* (зап. ад Евы Іванаўны Лешчанка, 1924 г. н., у в. Гаць). Паводле сведчанняў інфармантаў, Тройца святкуецца *«ў чэсць праслаўлення трыядзінства Божых іпастасаў: Бога Айца, Бога Сына і Бога Духа святога»* (зап. ад Праскоўі Маркаўны Цалка, 1924 г. н., у в. Рассвет). Упрыгожванне зелянінай хаты і падвор'я, збор людзей з некалькіх вёсак у адным месцы, наведванне імі кожнай хаты, выкананне траецкіх песень «Хадзіла Тройца каля аконца», «Ой, да белая бяроза», падрыхтоўка абрадавай стравы – яечні, завіванне вянкоў дзяўчатамі і развешванне іх на бярозах, ваджэнне карагодаў вакол кожнай бярозы, абрад «кумлення», які выконвалі дзяўчаты (*«Цалаваліся пад аркаю звязаных за голле бярозак. Пасля етага ім трэба было памагаць адна адной»* – зап. ад Евы Іванаўны Лешчанка, 1924 г. н., у в. Гаць) – важныя элементы траецка-сёмушнай абраднасці. У мясцовай траецкай традыцыі меў месца і звычай «развіваць вянкі», з якім былі звязаны міфалагічныя ўяўленні пра лёс чалавека: *«Чэраз нядзелю прыходзілі развіваць вянкі: калі чый вянок не ссох, той будзя доўга, а калі ссох – той у скорым часе ўмрэ»* (зап. ад Евы Іванаўны Лешчанка, 1924 г. н.); *«Калі вянок завяў, то гэты чалавек памрэ ці плоха яму будзе, можна забалець»* (зап. ад Евы Дзямідаўны Галавачэнка, 1929 г. н., у в. Любань). З траецкай зелянінай была звязана варажба, паводле якой вызначалі, якім будзе летняе надвор'е: *«А яшчэ на Тройцу можна было даведацца, якое будзе лета. Ставілі ля вакна ссечанаю бярозу. Калі яна высыхала за тры дні, то лета будзе сухое, калі не – то дождлівае»* (зап. ад Праскоўі Маркаўны Цалка, 1924 г. н., у в. Рассвет).

Прааналізаваны фактычны матэрыял па масленічнай абраднасці і асобных з'явах веснавой каляндарна-абрадавай паэзіі Акцябрскага раёна дазваляе зрабіць высновы аб устойлівай захаванасці агульнанацыянальных структурных элементаў і яскрава выражанай мясцовай спецыфіцы абрадаў і песень.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Акцябрскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – 478 с.
2. «Берагіня». Першы фестываль фальклорнага мастацтва. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1999. – 208 с.
3. «Берагіня». Другі фестываль фальклорнага мастацтва. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – 232 с.

РЕЗЮМЕ

В статье рассматриваются местные особенности бытования отдельных явлений весенней календарной обрядности Октябрьского района Гомельской области.

SUMMARY

Local peculiarities of individual phenomenon existence in spring calendar ritualism of Oktiabyr district, Gomel region are studied in the article.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ